**Міхно, У**. Болі. Афганістан / У. Міхно // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 1988. — 12 лістап. — С. 2.

## БОЛІ. АФГАНІСТАН

**Нарыс**

Забылася восень на вясковых могілках, за Ізгародзішчам, дні «бабінага лета». А вы не бачылі? Схадзіце – лістота была тады сухая, ідзеш, бы па хаце, хоць ты разувайся. А цішыня, як у бога за пазухай, райскія дні. Схадзіце. Яно ж і нябожчыкі – народ наравісты, любяць, каб помнілі іх, пакуль да іх ходзяць, датуль яны, кажуць, і жывуць.

Мы дык з Сашам схадзілі ўжо. На матацыкле ехалі, спыніўся ён і павёз мяне паўз курганкі замшэлыя да блакітнай агароджы, да халоднае гранітнае пліты. Глянулі раптам адтуль хлапечыя вочы, цёплыя, зусім жывыя і, здалося, дакорлівыя – мо ад хвалявання здалося. І тады Саша сказаў:

– Вось...

Я прачытаў на пліце: «Валасач Аляксандр...», прачытаў: «загінуу пры выкананні службовага абавязку» і здзівіўся, было, чаму не дапісалі: «у Афганістане». Але ўспомніў, што ў той час з афганскае вайны ўсё яшчэ рабілі нейкую таямніцу, так што нават хлапцам, якім было ўжо цяпер усё роўна, бо і так вочы пакрылі цынкам і пахавалі ў зямлю, хлапцам гэтым не пакідалі нават апошняга і святога права – застацца афганцамі навек ў памяці.

Я сказаў цяпер пра тое Сашу, гэтаму, жывому, Сашу Іўкіну, але ён запярэчыў:

– І так жа ўсе ведаюць... Зрэшты, мы ў Афгане, калі хавалі сваіх, адразу ставілі помнікі.

Цяпер – ведаюць, бо цяпер яшчэ дужа баліць. А што будзе, калі нашы сыны і ўнукі закрыюць вочы нам?

Саша Іўкін мой цяпер новы знаёмы. А жыве ён тут, у Ізгародзішчы, во, у самай канцавой хаце, так што могілкі ледзь не на двары. Суседства, не кажы, вусцішнае. Ездзіў хлопец на работу кожны раз на сваёй новенькай «Яве» аж у Чашнікі – у пажарную часць. Ды толькі нешта вось надумаўся, зволіўся адтуль. Пойдзе ў свой саўгас.

– Навошта? – пытаюся.

– Вось, – адмахваецца, – трэба вось дома бацькам па гаспадарцы дапамагаць... Ты, зрэшты, касіць любіш?

– Неа, – шчыра прызнаюся, непрыемна згадаўшы, як хутка тады слабнуць рукі, толькі, бывае, за касу возьмешся. Вось табе і вясковы хлопец...

– То, можа, не ўмееш? Вось прыязджай да нас на каналы на сенакос – ураз навучышся.

На каналах працуе яго маці, Яніна Мікалаеўна, і пра сена дома не бядуюць – сям'я вялікая, касцоў хапае, абы з'ехаліся. А Сашка – што ж, ясна пры бацьках жыве, то і памочнік пад нумарам першым. Ды толькі «няма таго, што раньш было».

– Ён да вайны, – уздыхае Яніна Мікалаеўна, падпільнаваўшы, калі выйдзе сын на вуліцу, да матацыкла, – горы звярнуць мог, а цяпер не тое, я ж бачу. Ён малады пакуль, храбрыцца – пальца ў рот не кладзі. Пра нейкія там ільготы нават і слухаць не слухае. Няёмка яму, ды мы і самі пакуль, дзякуй богу, і ўсё ў нас ёсць, і нічога нам не трэба. Вунь тэлефон правялі без нічога ніякага... А

толькі як спіць наш Сашка, – нечакана ўсхліпнула жанчына, – тады асцярожна яго будзі. Ен – ўсё яшчэ на вайне...

ЯНЫ ўсё яшчэ на вайне, гэтыя вясёлыя, прыгожыя і статныя хлопцы, мае аднагодні, нашы сучаснікі, што на шумных гарадскіх дыскатэках і ціхіх вясковых прызбах прыціскаюць да грудзей каханне сваё і шэпчуць яму на вуха гарачае, непаўторнае, вечнае. Яны ўсё яшчэ на вайне, гэтыя, што, бывае, гойсаюць праз цёплыя летнія ночы на «Явах» ды «Іжах», будзячы палахлівых сонных старых.

Старыя па «сваёй вайне» наплакаліся, паперапаўспаміналі, і боль іх выпала недзе на глыбіні душы даўнім горкім асадкам. Маладая ж боль, у каго і зацуравала, і не крывавіць ужо свежыя раны, то ўсё адно бурліць, бы тое маладое віно, не даючы спакою ўночы, то падымае хлапцоў на горныя афганскія скалы, а то падкідвае ў забыццё міннымі выбухамі, ці апякае маланкамі думак, бы трапнымі снайперскімі стрэламі. А яшчэ яна, боль гэта, ляжыць халодная, пасыпаная жоўтым жвірам і прыціснутая гранітнымі надмагільнымі плітамі, спакойна-ўладарная, як сама памяць выплаканых вачэй.

Гартаю старонку за старонкай несамавітага дзембельскага альбома і пільна прыглядаюся да кожнага хлапечага твару. Сашыны баявыя сябры.

– Валодзька Перагінец, Яшка Шаўцоў, а гэта наш механік Ібрагім, – называе адзін за другім яшчэ не паспеўшыя пажоўкнуць здымкі хлапец, дыміць і акуратна складвае акуркі ў пепельніцу.

А я не перастаю здзіўляцца гэтым, здаецца, зусім не ваенным фоткам, дзе хлопцы смяюцца, блазнуюць, дурэюць, зусім як і мы некалі ў сваім Падмаскоў'і. Не магу паверыць, што некага з іх няма ўжо, да некага прыліпла трагічна непапулярнае ў маладосці слова «інвалід», і ўсе, усе яны цяпер ветэраны. Божа, гэта ж не тыя, сівыя, старыя – ля помнікаў, у дзень Перамогі, на ўрачыстых шэсцях і святочных салютах, гэта ж маладыя і прыгожыя. І мне цяпер становіцца сорамна перад гэтым альбомам за нашы бліскучыя, дзембельскія, ціснутыя прыгожымі залатымі літарамі, сорамна за нашы дзікунскія завядзёнкі, якія мы так дыпламатычна ахрысцілі «нястатнымі узаемаадносінамі». Мы таўчом ваду ў ступе і працэджваем яе праз рэшата, абараняючы ўласныя амоіцыі ці гонар мундзіра, а ГЭТЫЯ, афганцы, моўчкі дакорліва ківаюць галовамі, бы дарослыя – на блазноты дзяцей. Хіба я маю права вось зараз хаця б заікнуцца Сашу пра «сваю» армію, калі між намі цяпер ляжыць простая, крышачку выцвілая, несамавітая яго баявая «хэбэшка», без адзінае дурацкае вышыўкі ці нашыўкі, толькі ордэн «Чырвонай Зоркі», толькі медаль «За адвагу», медаль юбілейны і значкі. Яшчэ аднаго медаля няма – «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа», ён чакае хлапца ў ваенкамаце.

Ордэнам «Чырвонай Зоркі» не ўшаноўваюць,на шчасце, юбіляраў, ды і прыжыццёва ўручаюць яго не так ужо часта. На «хэбэшку» Сашы Іўкіна лягла «Чырвоная Зорка» ўжо ў мірных Чашніках акурат пад час юбілею. Было хлапцу роўна дваццаць, калі дагнала яго з афганскай вайны не смерць, а ўзнагарода. Пашанцавала. Але ці не занадта жахліва, калі «ўшаноўваюць» дваццацігадовых юбіляраў баявымі ордэнамі?

– Сам ваенком дзірку круціў, – задуменна ўсміхаецца хлапец, усё гэдак жа педантычна складваючы акуркі ў попельніцу.

...Рука задрыжэла і не трапляла распісацца, калі вясковая паштарка прынесла «з вайны» грошы.

Людцы, няўжо ж гэта і з маім там такое? – не вытрымала, запрычытала цётка.

Тады толькі даведаліся нарэшце Іўкіны пра сынава раненне.

Ен і зараз пра тое маўчыць. Гаваркі, зычлівы, памяркоўны хлапец – гатовы расказваць мне пра што хочаш: пра сяброў па Афгану, пра аулы ля горных рэк і тамашняга селяніна, пра Шынданд – горад службы і гарачы, пад семдзесят градусаў, пясок, нават пра саміх душманаў, толькі не пра бальнічны ложак. Ды і мне, шануючы яго маладосць, прызнацца, зусім не хочацца ні распытваць пра тое, ні пісаць.

І яшчэ адна у нас «забароненая тэма» – яго подзвіг. Перасмыкнуліся нервова вусны і адказ на маё настойлівае патрабаванне павісла ў сівым цыгарэтным дыме некалькі скупых слоў.

Тое было ў самым канцы службы. Ваявалі пад Чагчаранам. Дзембеляў на баявыя заданні ўжо не бралі. Папрасіўся.

– Чаму?

– Не сядзець жа склаўшы рукі.

Вывелі калону. Вярталіся. Пад гару БМР – яго баявая машына размініравання – ісці не хацела. Перашкаджаў трал. Рашыў адчапіць.

– Чаму?

– Але іх бы ўсіх перабілі. Трэба было спяшацца.

– А медаль? Медаль яшчэ напачатку...

Усё. Большага ён не раскажа, дзякуй, хоць гэта ўдалося «выцягнуць», ледзьве не сілаю. Большае маглі б расказаць хіба далёкія афганскія горы і цясніны, ды і тыя адно – маўчаць, свята аберагаючы таямніцу суровае былі савецкага воіна-інтэрнацыяналіста, сціплага ў сваёй дзіўнай хлапечай цнатлівасці. А калі горы і гавораць, то часцей адзіночнымі бліскучымі снайперскімі языкамі ці гарачым дыханнем мінных узрываў. Афганскія горы, відаць, расказалі б нам і яшчэ шмат чаго і гэтыя, дваццацігадовыя, апаленыя, дай бог, апошняю вайною, даўмецца не могуць. Бо толькі самае афганскае зямлі ведаць, чаго вартаю аказалася гэтая загадкавая вайна, якую, зрэшты, радавы савецкі салдат адваяваў сумленна і бескарысна. Гісторыі суджана паставіць усе кропкі на «і», і толькі яе, гісторыі, вывады стануць ісцінай у апошняй інстанцыі.

Дарэчы, пра сціпласць. Ах, яна, любая – наша прыгожае і высакароднае пачуццё! Суровая вайна зрабіла нашых афганцаў, абаронцаў нашых, настолькі сціплымі, што па-сутнасці безабароннымі перад вайною іншай, «ціхай», на якой хоць і не стралюць, але таксама бываюць ахвяры. Вайна гэта з бюракратызмам, коснасцю, чэрствасцю, непавагай, валакітаю. Вяртаюцца хлапцы дадому і часта трапляюць пад прыцэл халоднага разліку.

Зусім выпадкова даведаўся я пра тое, што зволіўся Саша Іўкін з пажарнае часці не толькі па уласнае прыхамаці. Быў, аказваецпа, канфлікт з кіраўніцтвам. Адсюль, відаць, і гэты месяц, які хлапец павінен быў яшчэ «адпрацоўваць» пажарнікам. Быццам не выплаціў хлапец доўг свой агню і дыму там, у Афганістане. Ні словам не паскардзіўся мне, карэспандэнту, пра тое сам Іўкін. Як жа! Не ў іх «афганскіх» правілах некаму скардзіцца. Заўсёды самі за сябе прывыклі думаць. Паўтараю, даведаўся выпадкова і можа б, нават не пісаў пра тое, каб увечары у газеце «Известия» (18 кастрычніка г. г.) не прачытаў артыкул «Долг, который выплачивают бывшие воины-афганцы», артыкул пра яшчэ двух афганскіх Сашаў, што аддаўшы доўг інтэрнацыянальны, цяпер – божа, які сорам, наш агульны сорам! – выплочваюць «доўг»... за пакалечаную на той вайне тэхніку, сума падлічана з зайздроснай дакладнасцю – да васьмідзесяці васьмі капеек. Каментарыі тут, ясна, лішнія. А вось вывады...

«К воинам-интернационалистам... применяется принцип рентабельности с точностью до восьмидесяти восьми копек. Огромный экономический эффект, – іранізуе газета. – Но какое отношение этот эффект и эта бухгалтерия имеют к гуманизму, милосердию и нравственности – даже аллах не знает».

Дык, можа, варта і нам запытацца, які эканамічны ці юрыдычны «эфект» дала ў даным выпадку адпрацоўка хлапцом-афганцам вызначанага законам месяца? Хіба такой «кампенсацыяй» павінны мы былі сёння заплаціць Яніне Мікалаеўне Іўкінай, за тое, што два бясконцыя гады чакала з афганскай вайны не сына, а казённага «газіка»? Тады ж, улетку восемдзесят пятага, калі Ізгародзішча хавала Сашу Валасача, тады у яе бадай на двары стаялі «газікі», было многа начальства. Увосень пайшоў на вайну яе Саша.

Такое жыццё. Спагадлівасць і нераўнадушша падчас уступаюць у юрыдычную супярэчлівасць з цыркулярамі і інструкцыямі. І тады «трацейскім суддзёй» становіцца толькі адно наша сумленне.

Яніна Мікалаеўна выйшла праводзіць нас на вуліцу, і, калі ўжо ўселіся на матацыкл, зычліва нагадала сыну:

– Саша, пaціху едзь. Мы асцярожна выехалі за вясковую ваколіцу і – шукай ветру ў чыстым полі.

Ды хіба можа цяпер Саша «пaціху»? Гэта азначала б – капітуляцыя і – паплесціся ў хвасце ўласнага лёсу, прымхлівага і падчас ненадзейнага, і тады хто ведае, куды, паслухмяны, зойдзеш, скарыўшыся яго волі?

Ён не прывык слухацца разважлівай асцярожнасці, бо ён прывык слухацца толькі свайго сэрца і лічыць яго частыя, моцныя ўдары: тук-тук-тук-тук, бы міна з часавым механізмам, нават тады, калі калоцяцца неслухі-рукі, як было ТАМ заўсёды, калі мінашукальнік падаваў трывожныя сігналы. Хто сказаў, што не бывае страшна – плюньце ў вочы яму! Проста ёсць яшчэ і над страхам нейкае сваё «але». Зрэшты, ці не адчай выратаваў хлопца і там, у далёкіх гарах?

Вецер свістаў цяпер насустрач сотнямі... Глупства. Я не маю такога права – напісаць «сотнямі куль», бо я гэтага не ведаю. Так, седзячы цяпер за шырокаю спіной «афганскага» хлапца, я, вядома, адчуваў сябе каралем і сапраўды стараўся ўявіць тую чужую і невядомую краіну, правесці нейкія паралелі. Дарэмна. Нічога не атрымлівалася. І толькі адно магу сказаць пад чэснае слова. Ляцець навыперадкі з ветрам было мне ані-колечкі не страшна. Была цвёрдая ўпэўненасць, што гэты адчайны, моцны хлапец зробіць усё менавіта так, як яно і трэба, як яно і будзе лепей.

Падумаў, добра – даверыцца мацнейшаму. А толькі ці не хаваемся мы і сапраўды падчас за шырокую спіну, былых воінаў-інтэрнацыяналістаў у разгубленасці перад шматлікімі маладзёжнымі праблемамі? Так, гэтыя хлопцы могуць дапамагчы і не адмовяць. Толькі не трэба забываць, што яны ўсё яшчэ на вайне. А нам, зрэшты, пара і самім навучыцца – за рулём.

Кастрычнік, усё ж – не месяц ездзіць верхам на матацыкле. У Чашніках падаю Сашу на развітанне халодную руку.

– Замёрз усё-такі, – дакорліва ківае галавою хлапец.

Зусім як старэйшы, падумаў я і ўсміхнуўся. Але ж ён і сапраўды стаў для мяне цяпер намнога старэйшым, мой дваццацігадовы франтавік і ветэран.

Гэтая далёкая і самая блізкая, гэтая невядомая і такая балючая кожнаму сэрцу нашаму вайна. Недалёкі той час, недалёкае тое пятнаццатага лютага тысяча дзевяцьсот восемдзесят

дзевятага, калі апошні савецкі воін-інтэрнацыяналіст пакіне шматпакутную, густа палітую крывёю афганскую зямлю. Але сёння яшчэ кладуць выбухі мін і варожыя дальнабойныя залпы ахвярамі і нашых лепшых сыноў, яшчэ ідуць і ідуць хлапцы служыць у Афганістан. Яны раслі, мужнелі, калі вайна ўчарашняя станавілася легендай. Заўтра была вайна.

**У. Міхно**